УДК 7.071:75(476.5-25)“1946/2017”

# Пошукі і эксперыменты ў творчасці Мікалая Драненкі

***Цыбульскі М.Л.***
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск*

*Артыкул прысвечаны асноўным этапам творчасці вядомага беларускага мастака з Віцебску Мікалая Драненкі (1946–2017), найбольш характэрным жанравым, тэматычным і стылістычным асаблівасцям яго жывапісных твораў. У кантэксце Віцебскай мастацкай школы другой паловы XX стагоддзя асоба гэтага жывапісца і графіка паўстае даволі індывідуальнай і выразнай. Уласцівае гэтаму мастаку экспрэсіяністычнае бачанне рэальнасці ў яго кампазіцыях праяўлялася ў дынамічных мадуляцыях рытмаў і колераў, эмацыянальнай архітэктанічнай напружанасці вобраза.*

*Акварэль і графіка на ўсіх этапах творчасці М. Драненкі захаплялі яго больш за іншыя віды мастацтва, паколькі асабліва адпавядалі яго экспрэсіўнай і дынамічнай натуры. Мастак шмат эксперыментаваў з акватыпіяй, рознымі графічнымі матэрыяламі. З сярэдзіны 1980-х Мікалай Драненка пэўны час працаваў у экслібрысе, выканаў цікавую серыю кніжных знакаў,*

*Як і ў акварэльных аркушах, прыродныя матывы ў алейных творах М. Драненкі заўсёды маюць эмацыянальную вобразную інтэрпрэтацыю. Краявіды, напісаныя мастаком, адметныя адзінствам у падыходзе да вызначэння вобраза, дзе цэнтральнае месца займаюць эмоцыі творцы.*

*Плакаты, якія ў розныя перыяды распрацоўваў М. Драненка, гэта не толькі яскравыя сведкі мастацкіх падзей мінулага стагоддзя, але і своеасаблівыя артэфакты свайго часу. Знешняя лаканічнасць, дэкаратыўная стрыманасць і раўнавага форм у іх кампазіцыйнай пабудове не могуць схаваць уласцівага мастаку імкнення да дынамікі і экспрэсіі. Захапленне тыражнай графікай было шчыльна звязана і з працай над мастацкім афармленнем буклетаў і каталогаў. Мікалаем Драненкам зроблена больш за паўсотню падобных выданняў. Мастацкае аздабленне гэтых выданняў дае магчымасць адчуць танальнасць эпохі, для якой плакат быў адным з важных накірункаў развіцця мастацтва.*

***Ключавыя словы:*** *Мікалай Драненка, Віцебская мастацкая школа, Віцебская школа акварэлі, акварэль, алейны жывапіс, графіка, плакат, каталогі віцебскіх мастакоў.*

*(Искусство и культура. – 2022. – № 2(46). – С. 9–14)*

# Searches and Experiments in Mikalai Dranenka’s Work

***Tsybulski M.L.***
*Education Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University’, Vitebsk*

*The article centers round the main creative work stages of an outstanding Belarusian artist from Vitebsk Mikalai Dranenka (1946–2017), most typical genre, thematic and stylistic features of his paintings. In the context of the late 20th century Vitebsk art school the personality of this painter and graphic artist is quite individual and outstanding. The expressionist vision of the reality typical of this artist manifested itself in dynamic modulations of rhythm and color, in emotional architectonic tension of the image in his compositions.*

*Watercolor and graphics inspired M. Dranenka more than other art types at all the stages of his work since they corresponded his expressive and dynamic nature. The artist experimented a lot with water-type, with different graphic materials. Since mid-1980s Mikalai Dranenka did Xlibris; he created an interesting series of book signs.*

*As well as in water colors, nature motifs in M. Dranenka’s oil paintings always have emotional image interpretations. The artist’s landscapes are distinguished by the unity of approaches to the image where the central place is taken by the author’s emotions.*

*Posters, which M. Dranenka created in different periods, are not only bright evidence of the art events of the last century but also special artefacts of their time. Outer laconicism, decorative reserved character and balance of forms in their compositional structure can not hide the artist’s desire for dynamics and expressionism. The interest in printing graphics was also connected with the work at artistic decoration of booklets and catalogues. Mikalai Dranenka produced more than fifty issues. The artistic image of these publications makes it possible to feel the tone of the century in which the poster was one of significant art development trends.*

***Key words:*** *Mikalai Dranenka, Vitebsk art school, Vitebsk water color school, graphics, water color, oil painting, poster, catalogues of Vitebsk artists.*

*(Art and Cultur. – 2022. – № 2(46). – P. 9–14)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

На багатым творчымі талентамі віцебскім ландшафце мастацтваў асоба жывапісца і графіка Мікалая Драненкі (1946–2017) паўстае даволі індывідуальнай і выразнай. Уласцівае гэтаму мастаку экспрэсіяністычнае бачанне рэальнасці ў яго кампазіцыях праяўлялася ў дынамічных мадуляцыях рытмаў і колераў, эмацыянальнай архітэктанічнай напружанасці вобраза. А яшчэ ў асаблівай прыхільнасці мастака да эксперымента і свабоднага выкарыстання разнастайных выяўленчых тэхнік і тэхналогій. Менавіта таму яго жывапісныя і графічныя творы выглядаюць як вольныя аранжыроўкі рэальнасці, дзе пануе дух гульні і адметная, уласцівая нашаму сённяшняму жыццю тэмпаральнасць.

Амаль два дзясятка персанальных выстаў, велізарны пералік міжнародных і рэспубліканскіх мастацкіх экспазіцый, у якіх Мікалай Драненка прымаў удзел, яскрава сведчаць аб яго дзейнасці. Дыяпазон творчых захапленняў мастака таксама вельмі шырокі: акварэль і алейны жывапіс, шаўкаграфія і манатыпія, малюнак і плакат, экслібрыс і дызайн кнігі... І тым не менш аб жыцці і творчасці мастака не існуе даследаванняў. Усяго два каталогі і некалькі артыкулаў. Кніга, якую сумесна з М. Драненкам рыхтаваў аўтар гэтага матэрыялу, на жаль, так і засталася не выдадзенай...

Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць асноўныя этапы творчасці М. Драненкі, выявіць найбольш характэрныя жанравыя, тэматычныя і стылістычныя асаблівасці яго жывапісных твораў, а таксама дызайнерскіх распрацовак.

**Хроніка жыцця і творчасці.** Мікалай Драненка нарадзіўся 3 жніўня 1946 г. у в. Маргойцы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. “У мяне было шчаслівае дзяцінства, – узгадваў мастак, хоць, безумоўна, і не такое ўжо лёгкае. Напэўна, як і ва ўсяго пасляваеннага пакалення” [1]. Вучыўся будучы мастак у Беліцкай сярэдняй школе (1953–1964), якая месцілася ў старажытнай сядзібе памешчыка Карла Свяцкага. Многія аднакласнікі М. Драненкі ведалі і ганарыліся тым, што ў Беліцкай школе ў 1903–1904 гадах працаваў Янка Купала, аб чым сёння сведчыць і памятная дошка на гэтым будынку. “Вучыўся я, здаецца, нармальна, быў выдатнікам. Мяне захапляла канструяванне. Ідэй было шмат (...) Ужо пазней удзельнічаў у школьнай самадзейнасці, у розных конкурсах, маляваў насценгазеты” [1]. У старэйшых класах М. Драненка захапіўся спортам: у 9-м – ён стаў чэмпіёнам раёна па лыжах, а ў 11-м – заняў другое месца сярод юніёраў у рэспубліцы па кросу.

Але быць мастаком у дзяцінстве ён не марыў. Ды і наўрад ці добра ўяўляў сабе ў той час сутнасць гэтай прафесіі. Недзе ў пятым класе школы Мікалаю Драненку давялося прыняць удзел у абвешчаным Маскоўскай школай-інтэрнатам мастацтваў конкурсе дзіцячых малюнкаў. Неўзабаве ён атрымаў запрашэнне на вучобу ў Маскву. Але бацькі не рызыкнулі адпусціць хлопца ў такі далёкі шлях.

Напэўна, усё склалася б у жыцці Мікалая Драненкі інакш, калі б яго малюнкі, на якіх ён старанна занатоўваў свае ўражанні ад надзвычай прыгожага бору ці бліскучай гладзі возера, замалёўваў злоўленую рыбу ці раптам убачаную вясёлку, не трапілі аднойчы ў рукі сапраўднага мастака. Гэтым майстрам быў Валянцін Дзежыц, выдатны каларыст, майстар лірычнага пейзажа, на той час загадчык кафедры мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута. Ён і ўбачыў парасткі адоранасці ў трапяткіх малюнках юнака. “Не ведаю дакладна, з якой нагоды ён апынуўся ў нашай школе, але, прагледзеўшы мае малюнкі, адразу вынес свой вердыкт: «Вы працавіты малады чалавек. Вам трэба ісці да нас вучыцца мастацтву»” [1].

Прайшоў пэўны час. І аднойчы Мікалай Драненка прыехаў на чарговыя спаборніцтвы ў Віцебск ды завітаў у інстытут. “Памятаю, як Дзежыц сустрэў мяне, спускаючыся па лесвіцы, і накіраваў паглядзець і паспрабаваць свае сілы ў майстэрню да Клікушына. Некалькі дзён я пыхкаў за мальбертам. А потым былі ўступныя экзамены. Залічэнне” [1]. З пачуццём вялікай удзячнасці прыгадваў М. Драненка першыя ўрокі таленавітага мастака, яго рэкамендацыі больш сур’ёзных заняткаў малюнкам і жывапісам. На жаль, знаёмства з В. Дзежыцам было даволі кароткім. Мікалай Драненка вучыўся яшчэ на першым курсе, калі да іх у майстэрню завітаў Клікушын і паведаміў аб смерці В. Дзежыца.

З 1964 па 1969 год Мікалай Драненка – студэнт мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Працэс вучобы ў выкладчыкаў, асноўную большасць якіх складала моладзь, што нядаўна скончыла ВНУ і была апантаная творчымі памкненнямі, запомніўся яму назаўсёды. Гэта была і праца ў цішы вучэбных майстэрняў над акадэмічнымі пастаноўкамі, і шматлікія парады выкладчыкаў жывапісу і малюнка І. Сталярова, А. Гаўрушкі, спасціжэнне асноў кампазіцыі на занятках у Я. Красоўскага і паездкі на пленэр з Л. Анцімонавым і шмат, шмат іншага...

Пасля заканчэння інстытута М. Драненка некалькі год (з 1969 па 1977 г.) працаваў мастаком-афарміцелем у Віцебскім аўтамотаклубе ДТСААФ. Менавіта ў той час ён пачаў засвойваць складаную тэхніку

шаўкаграфіі для друку плакатаў, у якіх на гэтым месцы працы была вялікая патрэба. Пазней тэхніка шаўкаграфіі стане не проста прыкладной для тыражыравання афіш, запрашальных білетаў і іншай паліграфічнай прадукцыі, якую ўласнаручна распрацоўваў М. Драненка, але ператворыцца ў сапраўдную эксперыментальную прастору для многіх яго ідэй і фантазій.

У 1973 г. Мікалай Драненка прыняў удзел у Міжнародным конкурсе на распрацоўку эскізаў эмблемы медалёў і знакаў чэмпіяната свету па біятлоне, што праходзіў у Мінску. Работы мастака былі адзначаны прызам і малады жывапісец атрымаў першы ганарар за свае распрацоўкі. А ў 1976 г. ужо з акварэльным партрэтам "Ядзвіга" М. Драненка прыняў удзел у абласной мастацкай выстаўцы партрэта ў Віцебску [2]. Так быў пакладзены пачатак яго ўдзелу ў творчых конкурсах і выставах прафесійных мастакоў.

Новы этап у жыцці і творчасці мастака пачынаецца ў 1977 годзе, калі ён паступае на працу ў Віцебскія мастацка-вытворчыя майстэрні Мастацкага фонду БССР. У 1979 годзе М. Драненка становіцца галоўным мастаком гэтай установы (на гэтай пасадзе ён працаваў да 1982 г.). Адзначым, што М. Драненка быў першым галоўным мастаком, які не з'яўляўся сябрам Саюза мастакоў. Сапраўды, на той час гэта была амаль беспрэцэдэнтная з'ява.

Другая палова 1970-х – час актывізацыі творчай дзейнасці Мікалая Драненкі. Гэтага "прасіла душа", ды і пасада, адказнасць перад падначаленымі стымулявалі, прымушалі мастака працаваць дадаткова. Менавіта ў гэты час жывапісец стаў прымаць удзел у рэспубліканскіх выставах.

Першая персанальная выстаўка М. Драненкі адбылася ў 1981 годзе ў раённым доме культуры ў Сянно. У экспазіцыі было прадстаўлена 35 твораў, столькі ж, колькі ў той час мастаку было гадоў. А ў 1985 годзе ў віцебскім кінатэатры "Беларусь" адбылася другая персанальная выстаўка "Акварэлі Мікалая Драненкі". Літаральна праз год, да свайго 40-годдзя з дня нараджэння мастак таксама арганізаваў персанальную выстаўку ў Віцебску (1986). І зноў, сярод 33 твораў, што былі ў экспазіцыі, большасць складалі акварэлі.

У другой палове 1980-х мастак прымае ўдзел у шэрагу выставак, найбольш значнымі сярод якіх былі: Рэспубліканская выстаўка акварэлі і малюнка (1986, Полацк), рэспубліканская выстаўка "У краі блакітных азёр" (1987, Віцебск), абласная мастацкая выстаўка "800 год «Слова пра паход Ігаравы»" (1987, Полацк). М. Драненка становіцца таксама ўдзельнікам выстаў віцебскіх мастакоў у іншых рэспубліках СССР і ў замежжы (1986, Каўнас; 1986, Франкфурт-на-Одэры; 1988, Зелена Гура; 1989, Смаленск).

У 1989 г. Мікалай Драненка быў прыняты ў Саюз мастакоў СССР, а ў 1990-м – да таго ж стаў ганаровым членам Люблінскага таварыства сяброў мастацтва (пасведчанне № 44). Літаральна праз год мастак падрыхтаваў да выдання свой першы каталог з каляровымі ілюстрацыямі [3].

Разам з групай віцебскіх мастакоў, выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта розных гадоў, М. Драненка ў 1995 годзе прымае ўдзел у двух выстаўках акварэлі ў Віцебску і Полацку, падтрымлівае ідэю стварэння творчай суполкі "Віцебская акварэль" [4]. У наступныя гады ён становіцца актыўным удзельнікам большасці выстаў, што былі арганізаваны суполкай у розных кутках краіны (рэспубліканскія праекты: "Акварэльная сябрына" (1997, 2002, 2004), выставы ў Лідзе (1998), Пінску (1999) і ў замежжы.

Пленэр у творчасці М. Драненкі заўжды займаў важнае месца. У 1990-я гады мастак прымае ўдзел у шэрагу міжнародных і рэгіянальных пленэраў. "Прыродны матыў для мяне ў першую чаргу носьбіт эмацыянальнага настрою. Але ж для яго адлюстравання заўсёды даводзіцца шукаць найбольш выразныя выяўленчыя сродкі. Хочацца не згубіць свежасць пачуццяў, сакавітасць вобразных уражанняў..." [1]. У 1990 годзе мастаку пашанцавала трапіць на міжнародны пленэр з удзелам польскіх і беларускіх мастакоў ў Брэсце, у 1992 і 1999 гадах – на міжнародны пленэр у Пскове, а ў 2001-м – на міжнародны пленэр імя П. Масленікава ў Магілёве. Творы, што былі напісаны ў час гэтых творчых вандровак, экспанаваліся не толькі на пасляпленэрных выстаўках, але неаднойчы паказваліся на персанальных выставах М. Драненкі.

У 1990-я гады – у пачатку 2000-х Мікалай Драненка арганізуе вялікую колькасць персанальных выстаў у Віцебску, Оршы, Гарадку, Сянно. Большасць з іх былі прысвечаны толькі акварэлі ці графіцы (выстаўка графікі, 1990, Віцебск; выстаўка акварэлі, 1997, Гарадок; выстаўка "Свет акварэлі", 2001, Гарадок, Орша; "Плакат і афіша", 2004, Віцебск; выстаўка "Малюнак", 2009, Віцебск), іншыя былі тэматычныя (выстава, прысвечаная А. Пушкіну, 1998, Віцебск; "Retro акварэль", 2003, Віцебск) ці зборныя (выстава "Жывапіс. Графіка. Акварэль. Плакат", 2005, Віцебск). Да сваёй персанальнай выставы 1996 года "Акварэлі Мікалая Драненкі", што адбылася ў Віцебскім мастацкім музеі, жывапісец падрыхтаваў і выдаў другі каталог сваіх твораў [5].

У 2004 годзе М. Драненку выбіраюць старшынёй Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў. Нягледзячы на складанасці часу, ён спрабуе рабіць усё магчымае, каб падтрымаць у гэты няпросты час мастакоў, змагаецца за выставачную залу для іх, імкнецца адстойваць прыярытэты творцаў у вырашэнні пытанняў арэнднай платы за майстэрні і многае іншае. У інтэрв'ю часопісу "Мастацтва" Мікалай Драненка адзначаў: "Сёння нашы творцы актыўна фарміруюць сучасную прастору мастацтва, працягваюць і ўзбагачаюць традыцыі. І раз-пораз здзіўляюць сваімі адкрыццямі. Што да адметных мастацкіх падзей – на жаль, па фінансавых ці адміністрацыйных прычынах шматлікія нашыя праекты не рэалізоўваюцца. Пленэр, прысвечаны Хруцкаму, не праводзіцца; тое ж з пленэрам, прымеркаваным да экалагічнага форуму, на «Славянскім базары» не быў рэалізаваны праект «Дыялог-2004». Планавыя выставы праходзяць амаль на адным энтузіязме, але адбываюцца рэгулярна. 43 выстаўкі прайшлі летась, і не менш будзе і сёлета. Адбылася выстава віцебскай графікі ў Смаленску. І, на жаль, не атрымалася арганізаваць яе ў Мінску" [6]. Шмат у чым менавіта намаганнямі М. Драненкі была актывізавана праца над першым і пакуль што адзіным выданнем пра віцебскіх мастакоў [7]. Арганізаваная ім мастацкая выстаўка "Палітра Віцебска" ў межах Дзён Віцебскай вобласці ў г. Масква (Расія, галерэя "Кентаўр") стала выдатнай прэзентацыяй магчымасцей вядомай у Расіі віцебскай мастацкай школы.

Сярод найбольш значных мастацкіх праектаў 2000-х, у якіх прыняў удзел М. Драненка, можна прыгадаць міжнародную выставу графікі "Знакі часу" (2008–2010, Віцебск, Даўгаўпілс, Рыга), выставу "Альма-матар", прысвечаную 50-годдзю мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава (2009, Віцебск), рэспубліканскую мастацкую выставу "Зямля пад белымі крыламі" (2010, Віцебск, Магілёў), рэспубліканскую выставу "Альфрэду Ромеру – 180 год" (2013, Мінск, Віцебск).

Да свайго 65-годдзя Мікалай Драненка падрыхтаваў адразу дзве экспазіцыі, якія ён аб'яднаў у адзін мастацкі праект пад назвай "У коле сёмым". У Цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў "Дзвіна" адкрылася вялікая выстава алейных твораў, што былі напісаны ў розныя гады. А ў Віцебскім мастацкім музеі экспанаваліся акварэль і графіка, узоры паліграфічнай прадукцыі, распрацаваныя мастаком. Пяцьдзясят пяць твораў М. Драненкі былі перададзены аўтарам у дар Віцебскаму мастацкаму музею.

У апошнія гады жыцця М. Драненкі было нямала сустрэч і гутарак з дзецьмі. Ён з задавальненнем адгукаўся на прапановы зрабіць выставу ці правесці практычны майстар-клас у дзіцячых мастацкіх школах, эстэтычным цэнтры "Маладзік". Знакавай стала сустрэча мастака з вучнямі і настаўнікамі Пастаўскай дзіцячай мастацкай школы імя А. Ромера і Глыбоцкай дзіцячай мастацкай школы імя Язэпа Драздовіча ў Паставах у кастрычніку 2014 г. [8].

Рэтраспектыўная экспазіцыя жывапісу, прымеркаваная да 70-гадовага юбілею Мікалая Драненкі, была апошняй у яго жыцці. На ёй было паказана нямала твораў мастака, якія раней нідзе не дэманстраваліся. А 3 ліпеня 2017 года М. Драненкі не стала.

**Акварэль і графіка.** Для кожнага мастака выбар сродкаў выражэння ёсць, у першую чаргу, справа ўласнага тэмпераменту. Акварэль і графіка на ўсіх этапах творчасці мастака захаплялі яго больш за іншыя віды мастацтва, паколькі асабліва адпавядалі яго экспрэсіўнай і дынамічнай натуры. Для М. Драненкі акварэль была яго стыхіяй, яго творчай прасторай. "Гэта тэхніка па сваёй сутнасці ўяўляецца неспасцігальнай, – пераканана сцвярджаў мастак, – працуючы ў ёй, я нярэдка адчуваю сябе быццам бы ў маленькай лёгкай лодцы, якую падхоплівае гуллівая плынь і на грэбні моцнай, неўтаймаванай хвалі імчыць і кружыць, кідаючы з віру ў вір. Кожны раз быццам бы ўпершыню змагаешся са свавольствам матэрыялу. Таму я, зусім не саромеючыся, прызнаю, калі праца не атрымалася. Прадбачыць вынік, разлічыць усё да дробязей у акварэльнай кампазіцыі амаль немагчыма. Задуманае часам атрымоўваецца рэалізаваць толькі з некалькіх заходаў" [9]. У гэтых словах гучыць зусім не прызнанне мастака ў сваёй бездапаможнасці, не пазёрства сталага майстра, а рэальны погляд на мастацтва акварэлі.

Свае першыя акварэлі мастак паказаў на выставах у канцы 1970-х. Сярод іх былі "Начны матыў", "Ціхая вуліца", "Над ракой Лучосай", "Лукомльская ГРЭС" (трыпціх), "Блакітны лес", "Кветкі", "Стажкі зімой", "У азёрным краі" і іншыя.

Праца з натуры ці ўражанні ад яе заўсёды вызначалі асноўныя кампазіцыйна-вобразныя рысы акварэляў Мікалая Драненкі. Між тым ужо ў ранні перыяд творчасці ён асаблівую ўвагу пачынае надаваць жывапісна-пластычнай выразнасці сваіх акварэляў, пошукам адметнай манеры пісьма. Мастак шмат эксперыментуе са змывамі фарбавага слою, працай сухімі шчацціннымі пэндзлямі па вільготнай паперы, а часам, наадварот, звяртаецца да лёгкіх экспрэсіўных лесіровак. Усе гэтыя сродкі

выкарыстоўваюцца ў пейзажных кампазіцыях М. Драненкі, у першую чаргу, для адлюстравання ўласных эмацыянальных перажыванняў і рамантычнага пафасу таго часу.

Пачынаючы з 1980-х ці ключавым жанрам у творчасці М. Драненкі становіцца акварэльны пейзаж. Сапраўды, "асноўныя творчыя ўдачы М. Драненкі звязаны з пейзажам, яго прыярытэтнасць у коле жанраў, да якіх звяртаецца мастак, несумненна" [3]. І гэта невыпадкова. Як узгадваў сам мастак, яго адносіны да прыроды, свету былі закладзены шмат у чым яшчэ ў дзяцінстве. Але не столькі стан прыроды, яе прыгажосць, колькі пачуцці мастака становяцца асновай вобразнасці ў акварэлях ад самага пачатку яго творчасці ("Вясна" (1981), "Ускраіна" (1981), "Над Дзвіной" (1981), "Возера Нарач" (1981). Значная большасць акварэльных краявідаў гэтага часу – панарамныя лірычныя, паэтычныя кампазіцыі. Зрэдку дамінантамі кампазіцый становяцца славутыя архітэктурныя помнікі ("Касцёл у Камаях" (1981).

На пачатку 1980-х мастак на сваёй радзіме напісаў серыю работ, прысвечаных Беліцы ("Блакітная сядзіба. Беліца" (1981), "Малабеліцкая ўскраіна" (1981), "Беліца. Ціхі вечар" (1984). Трыпціх "Сядзіба ў Беліцы" (1981) быў прадстаўлены на рэспубліканскай мастацкай выстаўцы "Песняры зямлі беларускай" (1982, Мінск), прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа.

У акварэлях М. Драненкі 1980–1990-х дамінуе рэалістычны прынцып адлюстравання, але ў іх не сустрэнеш складаных тэматычных ці сюжэтных канструкцый. Цэнтральнае месца ў кампазіцыях займаюць простыя вясковыя матывы, вобразы некранутай чалавекам прыроды. Сярод кампазіцый гэтага часу шмат твораў, прысвечаных прыродзе Віцебшчыны ("Зіма пад Віцебскам" (1986), "Гарадскі краявід" (1987), "Віцебск. Дрэвы" (1995), "Вясна ў Віцебску" (1996) і інш.).

Нярэдка ў сваіх творах М. Драненка аддаваў перавагу фармальна-жывапісным элементам, захапляўся адкрыццямі тэхнічных асаблівасцей акварэлі, спрабуючы зразумець таямніцы гэтага матэрыялу. Ужо ў канцы 1980-х у працах мастака пачынае з'яўляцца тая вольнасць і раскаванасць, тая неабмежаваная натурай вобразная канцэпцыя, якая стане характэрнай для яго сталай манеры. Акварэлі Мікалая Драненкі становяцца больш лёгкімі, уласна акварэльнымі, зробленымі быццам бы на адным дыханні. Мастак адмаўляецца ад неабходнасці планавага, прасторавага рашэння кампазіцыі, выбірае не абцяжараныя шматлікімі дэталямі сюжэты для сваіх твораў, спрабуе спалучыць розныя акварэльныя прыёмы. У яго акварэлях пачынаюць выразна "гучаць" вялікія колеравыя плямы вольна разлітай фарбы, падкрэслена экспрэсіўнай і дынамічнай становіцца манера выканання. Хуткі бег пэндзлю пакідае на паперы рухомыя сляды празрыстых фарбаў, побач з якімі белая некранутая папера ператвараецца ў частку адлюстраванай прасторы. І акварэлі быццам бы сапраўды ажываюць, пачынаюць дыхаць...

Гэта тэндэнцыя ў творчасці мастака становіцца ўсё больш відавочнай у кампазіцыях другой паловы 1990-х – 2000-я гг. "Мяне заўжды вабілі эфектныя, нетрадыцыйныя для акварэлі напрамкі. Я ніколі не задумваўся над тым, каб спецыяльна выпрацоўваць уласную стылістыку. І дагэтуль упэўнены: сапраўдны мастак заўжды непрадказальны!" [1].

На працягу ўсёй сваёй творчасці М. Драненка шмат эксперыментуе з акватыпіяй, рознымі графічнымі матэрыяламі. Сярод першых яго работ у акватыпіі – акварэльнай манатыпіі – кампазіцыя "Вёска" (1977). Велізарная колькасць твораў з выкарыстаннем розных прыёмаў акватыпіі была напісана мастаком у другой палове 1990-х – 2000-я гады. Многія з іх невялікія па памерах, але вельмі эфектныя і па-майстэрску выкананыя. У большасці з іх выразна адчуваецца моц характару і ўзровень жыццёвай энергіі творцы.

З сярэдзіны 1980-х Мікалай Драненка пэўны час працаваў у экслібрысе, выканаў цікавую серыю кніжных знакаў, якія былі экспанаваны на Усесаюзнай выстаўцы-конкурсе сучаснага савецкага экслібрыса ў Маскве ў 1985 годзе і адзначаны дыпломам. А ў наступным годзе мастак прыняў удзел у Рэспубліканскай выстаўцы экслібрыса (1986, Мінск), дзе паказаў 9 новых уласных работ.

Папулярнасць гэтага жанру графічнай мініяцюры на Беларусі ў гэты час была даволі высокая. У выставачнай зале Віцебскага краязнаўчага музея ў 1989 годзе прайшла Другая абласная выстава экслібрыса. Сярод 27 аўтараў, што прадставілі на выставе каля трохсот графічных мініяцюр, быў і М. Драненка. Гэтая выстава вызначыла час найвышэйшага ўздыму мастацтва кніжнага знака ў рэгіёне [10]. Творы з дадзенай выставы экслібрыса былі набыты Віцебскім краязнаўчым музеем. З непасрэдным удзелам М. Драненкі быў падрыхтаваны каталог. Са сваімі экслібрысамі мастак прыняў удзел і ў трэцяй абласной выстаўцы экслібрыса і малой графікі (1998, Віцебск).

**Алейны жывапіс.** Цікавасць да алейнага жывапісу, што зарадзілася яшчэ ў час навучання на мастацка-графічным факультэце, атрымала развіццё ў творчасці М. Драненкі ўжо

ў час яго працы ў Віцебскіх мастацка-вытворчых майстэрнях. Сярод першых алейных твораў мастака – "Партрэт хірурга-траўматолага Г. Ліцкалава" (1978), "Нацюрморт з грушамі" (1979), "Дзве дарогі" (1980), "Нацюрморт з мёдам" (1980). Але ні партрэты, ні нацюрморты не набылі такой папулярнасці ў далейшай творчасці жывапісца, як жанр пейзажа.

Як і ў акварэльных аркушах, прыродныя матывы ў алейных творах М. Драненкі заўсёды маюць эмацыянальную вобразную інтэрпрэтацыю. У аснове яго жывапісных палотнаў таксама ляжыць праца мастака з натуры. Напісаныя ім краявіды адметныя адзінствам у падыходзе да вызначэння вобраза. Алейныя творы мастака часцей "адлюстроўваюць не столькі стан прыроды, колькі стан душы творцы" [11].

Стылістычна алейныя кампазіцыі М. Драненкі больш блізкія па манеры выканання, чым яго акварэлі. Прыхільнасць да рэалістычных традыцый, аддавочная ў большасці твораў мастака, нярэдка спалучаецца з імпрэсіяністычнай інтэрпрэтацыяй натуры. Мастак не хаваў таго, што мастакі-імпрэсіяністы заўжды вельмі падабаліся яму за сваю радасць колеру і жыццесцвярджальнасць.

Вялікая колькасць алейных кампазіцый мастака прысвечаныя Віцебску. Напісаныя ў розныя гады кампазіцыі даюць магчымасць убачыць, як выглядаў горад некалькі дзясяткаў гадоў таму назад. Сярод твораў эцюды старой часткі Віцебска, кампазіцыі "Цырк «Прага» ў Віцебску" (пачатак 1980-х), "Віцебск. Растуць дамы" (1984), "Свята ў горадзе" (1980-я), "Форум будуецца" (1989), "Віцебск" (1992), "Лучоса" (1992), "Віцебск" (1992), "Від на плошчу Перамогі" (1990-я) і іншыя.

**Плакаты і каталогі.** Першыя вопыты ў галіне плаката, набытыя ў пачатку 1970-х у час працы мастаком у Віцебскім аўтамотаклубе ДТСААФ, мелі плённы працяг у 1980–1990-я гады. А засвоеная М. Драненкам тэхніка шаўкаграфіі дапамагла яму ўвасобіць у плакаце шэраг арыгінальных для таго часу творчых ідэй. Адносная тэхналагічная прастата і хуткасць выканання, магчымасць эксперыментаў асабліва прыцягвалі ўвагу мастака.

Плакаты, якія ў розныя перыяды распрацоўваў М. Драненка, гэта не толькі яскравыя сведкі мастацкіх падзей мінулага стагоддзя, але і артэфакты свайго часу. Рэкламныя плакаты тэматычных і персанальных выстаў віцебскіх мастакоў звычайна друкаваліся М. Драненкам невялікім тыражом (да 100 адбіткаў). Манера мастака ў плакаце пазнаваемая, паколькі нясе ў сабе агульныя рысы яго графічных эксперыментаў. Некаторыя рэкламныя плакаты тэматычных і персанальных выстаў віцебскіх мастакоў выкананы ў тэхніцы шаўкаграфіі ўручную, іншыя – надрукаваны афсетным спосабам у друкарні. Знешняя лаканічнасць, дэкаратыўная стрыманасць і раўнавага форм не могуць схаваць уласцівага мастаку імкнення да дынамікі і экспрэсіі.

Захапленне тыражнай графікай было шчыльна звязана і з працай над мастацкім афармленнем буклетаў і каталогаў. Мікалаем Драненкам зроблена больш за паўсотню падобных выданняў. У значнай колькасці з іх яму даводзілася выступаць у якасці куратара, аўтара-складальніка і выканаўцы ўсіх відаў дадрукарскай падрыхтоўкі. Мастацкае аздабленне гэтых выданняў дае магчымасць адчуць танальнасць эпохі, для якой плакат быў адным з важных накірункаў развіцця мастацтва.

**Заключэнне.** Прайшло амаль што пяць гадоў, як з намі няма нашага цудоўнага сябра, выдатнага мастака Мікалая Драненкі. У беларускім выяўленчым мастацтве, амаль ва ўсіх яго відах і жанрах, ён пакінуў свой адметны след, пра што сведчыць нават сціслая напісаная біяграфія мастака ў энцыклапедыях і даведніках [12]. Шырокае кола мастацкіх інтарэсаў і захапленняў Мікалая Драненкі ў чарговы раз пацвярджае, што апантаны мастацтвам чалавек заўжды накіраваны на эксперыментаванне, на пошукі сябе ў розных відах творчай дзейнасці. Дзякуючы ўнікальнай працавітасці і імкненню да адкрыццяў новага Мікалай Драненка, здаецца, знайшоў у графіцы і жывапісе ўласную адметную манеру.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Драненка, М. "Сапраўдны мастак заўжды непрадказальны..." / М. Драненка; запісаў М. Цыбульскі // Вечерний Витебск. – 1996. – 6 сент. – С. 2.
2. Лебедзеў, Г. Прыгажосць празрыстых фарбаў / Г. Лебедзеў // Віцебскі рабочы. – 1977. – 10 жн. – С. 4.
3. Николай Драненко: акварель / авт. текста Н. Гугнин. – Минск: гл. ред. фотоинформации БЕЛТА, 1991. – 16 с.
4. Цыбульскі, М. Экс-пазіцыя Віцебскай акварэлі, ці Прэзентацыя новай суполкі / М. Цыбульскі // Літаратура і мастацтва. – 1995. – 11 жн. – С. 13.
5. Мікалай Драненка: юбілейная мастацкая выстаўка / уклад. М.Л. Цыбульскі. – Віцебск, 1996. – 21 с.
6. Мікалай Драненка: "Цяжкая, амаль безнадзейная справа..." / М. Драненка // Мастацтва. – 2004. – № 11. – С. 25.
7. Саюз творцаў = A Union of creators: / уклад. і аўт. тэксту М. Цыбульскі; аўт. уступ У. Андрэйчанка. – Мінск: Беларусь, 2005. – 146 с.
8. Шапавалава, А. "Караліноўскія сезоны" Мікалая Драненкі [Электронны рэсурс] / А. Шапавалава // Govorim.by. Новости Постав. – 2015. – 23 лют. – Рэжым доступу: https://govorim.by/vitebskaya-oblast/postavy/novosti-postav/177523-karalnoskya-sezony-mkalaya-dranenk.html. – Дата доступу: 27.03.2016.
9. Цыбульскі, М. Свавольны дух акварэлі / М. Цыбульскі // Беларусь. – 1996. – № 9. – С. 19–20.
10. Вторая областная выставка экслибриса. Каталог / Н.А. Гугнин. – Витебск, 1989.
11. Васілеўскі, П. Шэсць адбіткаў у люстэрку часу / П. Васілеўскі // Культура. – 2016. – 5 жн. – С. 7.
12. Цыбульский, М.Л. Драненко Николай Алексеевич / М.Л. Цыбульский // Регионы Беларуси: энцикл.: в 7 т. / редкол.: Т.В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2: Витебская область. Кн. 1. – С. 386.


*Паступіў у рэдакцыю 18.04.2022*